УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПАЭТЫКІ “ЧЫСТАЕ КРАСЫ” Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І ЛЕАНІДА ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыпломная работа 33-02-14/2014/3
студэнткі 502 групы
5 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура. Журналістыка»
дзённай формы
атрымання адукацыі
____________Кульгавай
Марыны Юр’еўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ____________

Пратакол № 9 ад 24.04.2014 г.

Абаронена 20.06. 2014 г.
з адзнакай «дзесяць»

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
____________Заяц Н.В.

Мінск, 2014

Scanned by CamScanner

## РЭФЕРАТ

Кульгавая Марына Юр'еўна

**Рэпрэзентацыя паэтыкі "чыстае красы" ў творчасці Максіма Багдановіча і Леаніда Дранько-Майсюка**

**Ключавыя словы:** паэтыка, эстэтыка, эстэтычная катэгорыя, краса, прыгажосць.

**Аб'ект даследавання** – паэзія (вершы з цыклаў "Вянок", "Малюнкі і спевы", "Старая Беларусь", "Мадонны") і проза (апавяданні "Шаман", "Вясной", "Апокрыф", "Музыка", "Апавяданне аб іконніку і залатару") М.Багдановіча; паэзія і проза Л.Дранько-Майсюка (вершы і эсэ са зборнікаў "Тут", "Над пляцам", "Акропаль", "Паэтаграфічны раман", "Стомленасць Парыжам").

**Прадмет даследавання** – паэтыка "чыстае красы" ў творчасці Максіма Багдановіча і Леаніда Дранько-Майсюка.

**Мэта работы –** даследаваць рэпрэзентацыю паэтыкі чыстае красы і ўвасабленне асноўных эстэтычных катэгорый (прыгожага і ўзвышанага) у празаічных і паэтычных творах М.Багдановіча і Л.Дранько-Майсюка.

**Метадалагічнай базай** навуковай работы сталі найноўшыя напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і кампаратыўнага аналізу, герменеўтычны метад.

**Навуковая навізна.** Дыпломная работа з'яўляецца літаратуразнаўчым даследаваннем паэтыкі "чыстае красы" ў творчасці М.Багдановіча і Л.Дранько-Майсюка, дзе паказана спецыфіка рэпрэзентацыі асноўных эстэтычных катэгорый, выяўлены падабенствы і адрозненні ў раскрыцці эстэтычных поглядаў.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні дысцыплін літаратуразнаўчага профілю, падрыхтоўцы спецсемінараў і спецкурсаў па беларускай літаратуры, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner